Азёма К.У., студ. гр. 314
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,
ст. выкладчык

# КАФЕДРА ЭТНАЛОГІІ І ФАЛЬКЛОРУ БДУКМ ЯК АСЯРОДАК ЗАХАВАННЯ ЭТНАФАНІЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ

Разгляд праблем і перспектыў развіцця этнапедагагічных накірункаў у сістэме вышэйшай школы РБ – тэма адносна мала распрацаваная ў спецыяльнай літаратуры і сёння яна надзвычай актуальная. У апошнія гады дзеячы культуры і педагогі краін Усходняй Еўропы паслядоўна шукаюць шляхі будовы мадэлі адукацыйнага працэсу на падмурку традыцый мясцовых этнічных культур. Мэта іх дзейнасці – замацаваць у адукацыйным працэсе механізмы перадачы этнаэкалагічнага патэнцыялу свайго народа. Існуе праблема захавання і пераймання традыцыйных каштоўнасцей (асабліва на падставе асабістага жадання чалавека), якія з'яўляюцца гарантыяй стабільнага існавання грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гарантам пераемнасці такіх каштоўнасцяў і асноўным складальнікам этнапедагогікі з'яўляецца этнакультурнае выхаванне – набыццё грамадскакарысных ведаў, уменняў, навыкаў сродкамі пераймання народнай культуры і мастацтва. Яго адметная рыса – дакументальная аснова, таму этнакультурнае выхаванне – дзейнасць, якая грунтуецца на вывучэнні, засваенні і трансляцыі каранёвай культуры.

На сённяшні дзень стан развіцця этнічнай беларускай культуры з'яўляецца незадавальняючым. Беларуская культура недастаткова прадстаўлена ў дзейнасці устаноў сацыяльнай сферы, якія істотна праграмуюць светапогляд будучыні краіны – дзяцей і моладзі.

Культуры " этнасаў-гасцёў" добра і разнастайна прадстаўлены і запатрабаваны, што перашкаджае развіццю роднай культуры.Таму трэба сур'ёзна вывучаць пытанне пра заканамернасці і перспектывы этнакультурнага выхавання. Лепшы сродак далучэння моладзі да традыцыі – гэта развучванне з ёй гульняў і побытавых танцаў , расповеды этэалагічных

аповедаў, спевы ў фальклорных гуртах. [ 2,ст.94] Ужо даволі працяглы тэрмін гэтыя віды дзейнасці з'яўляюцца прадметам і сродкам навучання ў вышэйшай школе, у тым ліку на кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ . Таму я вырашыла даведацца пра сучасны стан развіцця фальклору на прыкладзе гуртоў кафедры;прааналізаваць дзейнасць гуртоў кафедры этналогіі і фальклору з мэтай азнаямлення і папулярызацыі іх здабыткаў сярод абітурыентаў і студэнтаў; выявіць сучасны стан адаптацыі беларускага фальклору ў студэнцкім асяроддзі; прасачыць за сістэмай этнакультурнага выхавання; прааналізаваць асноўныя прынцыпы арганізацыі працэсу выхавання сродкамі народнай культуры і зацікаўленасці студэнтаў у вывучэнні традыцыйнага фальклору; прааналізаваць традыцыйныя з'явы, якія аб'ядноўваюць выканаўцаў усіх гуртоў і выявіць кампаненты і рысы, якія адрозніваюць пэўны гурт ад іншых. Каб выканаць вышэйпералічаныя задачы я сустракалася з некаторымі кураўнікамі гуртоў кафедры і яны мне паведамілі шмат цікавага пра свае калектывы, а таксама пра дзейнаць кафедры.Гэтай інфармацыі няма нават на сайце БДУКМ, таму я спадзяюся, што мая праца будзе карыснай як для настаўнікаў кафедры, так і для студэнтаў, і абітурыентаў.

Гурт " Ветах" утвораны ў фальклорным руху Беларусі ў сярэдзіне 1990-х гадоў на глебе традыцыйных спеваў і дударскай музыкі, у якім аб'ядналіся аматары фальклору з Мінска. Сярод іх былі і некаторыя выкладчыкі БДУКМ . Стваральнікам і кіраўніком гурта з'ўляецца Вячаслаў Віктаравіч Калацэй. Назву гурту знайшлі ў песнях з Падзвіння, дзе неаднойчы былі ўдзельнікі гурта яшчэ да яго стварэння.«Ветах» – старабеларуская назва месяца ў трэцяй квадры. Творчасць гурта грунтуецца на досведу постфальклору на Беларусі, калі моладзь, пэўным чынам дакрануўшыся да традыцыі, імкнецца падоўжыць яе ў сваім урбанізаваным жыцці. Дзякуючы вядомаму беларускаму этнахарэографу, Козенка Міколу Аляксеевічу, удзельнікі калектыва пабывалі на многіх фальклорных аўтэнтычных фестывалях( такіх як Чачэрская полька, Берагіня і інш.) сустракаліся з мясцовымі выканаўцамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія прэзентавалі сваё мастацтва ў сцэнічных умовах. Вельмі важна, што музыкі бачылі фальклор менавіта ў сцэнічніх умовах,т.ш.сустрэча з носьбітамі традыцыі менавіта пад час святкавання таго ці іншага свята з’яўляецца найлепшым спосабам пераймання фальклору. Падчас фальклорных экспедыцый запісвалі матэрыял на аўдыё- і відэастужку,які пазней уваходзіў у рэпертуар гурта. Асноўныя выканальніцкія прынцыпы гурта базуюцца на узорах вывучання, каторыя былі характэрныя для каранёвай беларускай музыкі. Імкненне распрацаваць нейкія прыёмы ігры і стылістыкі,аднавіць ў межах 20-21 ст. тое, што некалі была і потым знікла , паспрыяла стварэнню канцэпцыі гурта, які існуе ў 21 ст.,але ж пры гэтым абапіраецца не на поп-музыку, не на рок,а менавіта на фальклорную музыку. Як расказаў кіраўнік гурта В.Калацэй: “Многія апаненты казалі, што гурт такога кшталту ўвогуле не зможа існаваць: не набярэ рэпертуару, будзе нікому не патрэбны,гэта ўсё вельмі сумна і не можа нікога прывабіць і г.д. Прыходзілася даказваць, а лепшы сродак доказу – гэта толькі справа. Гурт верны той канцэпцыі, якая была закладзена - гэта дударская музыка, толькі беларускі рэпертуар з апорай на каляндарную сістэму і мясцовы стыль выканання.” Канцэпцыю гурта складае адраджэнне інструментальнага саунда: дуда і скрыпка, ці дуда і акарына і інш.Такім чынам, дуда ў “Ветаху” з’яўляецца прымай. Большасшую частку рэпертуара гурта састаўляюць песні і музыка Цэнтральнага і Паўночнага рэгіёна Беларусі. Касцюмы ўдзельнікаў гурта адновілі па ўзорах касцюмаў Цэнтральнай Беларусі мастакі Марыля Барткова, Людзміла Бажок, Елізавета Фраленкова.

У “Ветаху” выпрацаваны асноўныя формы , метады ўвасаблення беларускага фальклору і ўкаранення яго ў сучаснае мастацкае жыццё. Вядомая форма для усіх калектываў аматарскай творчасці - сцэнічная інтэрпрэтацыя фальклору. Яна і “Ветаху” ўласціва (ствараліся фальклорныя праграмы увасобленыя ў тэматычныя блокі, праграмы паводле калядных песень, масленічных песень і інш) .У “Ветаху” моцна развіта танцавальна-гульнявая этнафонія, яскрава прасочваецца імкненне “сцягнуць” са сцэны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнафонію бліжэй да людзей, каб уключыць гледача ў працэс дзеі (карагоды, танцы, гульні). Трэба адзначыць, што першыя дударскія дыскатэкі ў Мінску былі наладжаны дзякуючы стваральнікам гурта ў 2001 годзе. Вопыт, накоплены гуртом “ Ветах”, шмат ў чым спрыяў стварэнню і адкрыццю кафедры этнафоназнаўства і фальклору. Зараз на кафедры існуюць гурты, якія складаюцца са студэнтаў розных курсаў. Так студэнты першага набору спецыялізацыі “Этнафоназнаўства” утварылі гурт “ Этнасуполка”, кіраўніком якога з’яўлялася Т.Пладунова. Дзяўчаты гэтага гурта скончылі ВНУ у прошлым годзе.

Зараз выпускным калектывам з’яўляецца гурт “Кроса”.Гурт ўтвораны ў 2005 годзе пад кіраўніцтвам фалькларыста,артыста размоўнага жанру ст.выкладчыка Ларысы Рыжковай. Ларыса Мікалаеўна мае вялікі педагагічны стаж (працуе у гэтым жанры больш за 30 год),мае рэжысёрскую адукацыю. Гурт складаецца з шасці дзяўчат,таму першапачаткова хацелі назваць яго “ Пяюхі”.Але потым супольна вырашылі назваць “Кроса”, што азначае “дзявочая прыгажосць”. Канцэпцыю гурта складае імкненне кіраўніка абудзіць у кожнага свойго выхаванца фальклор яго душы. Ларыса Мікалаеўна дазваляе спяваць кожнаму песню так, як ён разумее, а потым ужо надае гэтаму пэўную форму. Важнае месца займае індывідуальны падыход. Яна прапануе студэнтам пераўвасобіцца ў таго ці іншага персанажа песні і выканаць твор ад яго асобы. Фальклор – гэта стыхія, якая праходзіць праз кожнага чалавека,выканаўцу і па сродках калектыўнай стыхіі выбудоўваецца твор мастацтва. Рэпертуар гурта складаецца з матэрыялаў, сабраных імі падчас фальклорных экспедыцый, а таксама з твораў агульнай фанатэкі кафедры. Дзяўчаты выконваюць шмат песень тых мясцін, адкуль яны самі родам,гэта Лунінецкі раён, Веткаўскі раён, Гомельшчына, Гродзеншчына і інш.

У 2006 годзе на кафедры з’явіўся гурт – “Любошчы”. Кіраўнік гурта – фалькларыст, ст. выкладчык Наталля Матыліцкая. Назва калектыва была ініцыіравана Т. Пладуновай.” Цёплыя узаемены,часам дзёрзкія, часам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забаўныя былі паміж здяўчатамі і хлопцамі гурта,але яны заўсёды рады адзін адному,” – адзначае Т. Пладунова, таму яна іх так і назвала -”Любошчы” .Слова паходзіць ад дыялектнага “ пяшчотныя узаемаадносіны”, “ закаханасць”. Канцэпцыю гурта, а таксама яго рэпертуар вырашыў склад удзельнікаў калектыва. Рэпертуар складаецца ў асноўным з жартоўных, пазаабрадавых і лірычных песень. Удзельнікі заўсёды ахвотна і лёгка ладзілі танцы. Асноўнае месца ў рэпертуары займае фальклорны матэрыял са Случчыны, в. Усполле (Жыткавіцкага раёна), Брэсцскага Палесся і Гомельшчыны.

Студэнты чацьвёртага набора “Этнафоназнаўства” утварылі гурт “ Раме” у 2007 годзе. Назву гурту даў кіраўнік – Вячаслаў Калацэй.” Раме” ад старабеларускага “рамёна” – плечы. Слова сустракаецца ў летапісах, старажытных песнях. Назвай кіраўнік дац. В.Калацэй падкрэсліў, што удзельнікі гурта моцна дапамагаюць яму ў дзейнасці “ Ветаха”, аказваюць падтрымку. Гурт складаецца амаль з адных хлопцаў, таму канцэпцыя гурта створана з апорай на мужчынскую спеўную традыцыю і інструментальную музыку. Рэпертуар гурта складаюць рэкрутскія, валачобныя,велічныя,юраўскія песні (усе тыя творы,якія традыцыйна гучалі ў выкананні мужчын). У рэпертуары прысутнічаюць калядныя і купальскія песні, дзе мужчыны таксама удзельнічалі. Прынцып выконвання песняў : перайманне з запісаў, кантакты з носьбітамі. Музыкі граюць наінструментах характэрных для каранёвай музыкі Беларусі: дуда,скрыпка, ударныя, гуслі.Вялікую часку рэпертуара складае матэрыял Паўночна-Заходняга рэгіёна Беларусі, дзе захавалася моцная рэкруцкая традыцыя і валачобныя песні гэтага ж рэгіёна. Касцюмы на замову вырабляла майстар Марыля Барткова з упорам на паўночна-заходнюю частку Беларусі.

Гурт “ Вяснянка” утвораны ў 2008 годзе пад кураўніцтвам Наталлі Петуховай. Калектыў атрымаў назву “Вяснянка” у гонар веснавых песень, якія выконваліся заўсёды толькі дзяўчатамі. Рэпертуар гурта арыентаваны на аўтэнтычны узор.Слыхавое перайманне з’яўляецца асноўным прынцыпам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучання песень, але ж  не выключаецца і расшыфроўка песень ( пераклад іх на нотную грамату). Гурт выконвае шмат песень, сабраных супрацоўнікамі акадэміі мастацтваў,падчас іх фальклорных паездак па Беларусі. Рэпертуар базуецца на песнях, якія выконвалі пераважна дзяўчаты,гэта абуслоўлена выключна дзявочым саставам гурта. У прыватнасці, зараз калектыў працуе над веснавымі песнямі абраду ваджэння і пахавання стралы. Значнае месца у рэпертуары займаюць песні Гомельскай і Брэсцкай вобласці, асабліва вяснянкі і купальскія песні. Строі дзяўчатам шылі іх бабулі, а некаторыя і самі здолелі зрабіць сабе канцэртную вопратку.

Трэба адзначыць, што есць на кафедры і супольны фальклорна-харавы гурт, які мае назву “Талака”.  Талака – форма арганізацыі супольнай працы ва усходнееўрапейскім рэгіёне з неалітычных часоў. “Талака” аб’ядноўвае ў сабе студэнтаў  усіх пяці курсаў спецыялізацыі “Этнафоназнаўства”. Кіраўнік гурта – Вячаслаў Калацэй. Канцэпцыя скіравана на стварэнне канцэртных праграм на дакументальнай аснове. У кожнай праграме абавязкова увасоблена нейкая рэгіанальная этнафанічная традыцыя. Удзельнікі гурта вывучаюць этнафанічныя традыцыі усіх рэгіёнаў Беларусі, а на сцэну звычайна выносяццьь той рэгіён, у якім лепш захавалася традыцыя. На свяце звычайна збіраліся людзі, якія жылі ў пэўнай вёсцы. Гурт “ Талака”як раз мае неабходную колькасць людзей, якая можа адлюстраваць святкаванне пэўнай традыцыі на вёсцы. У дзейнасці гурта спалучаюцца харавая і музычная традыцыя, танцы і гульні. Усе віды і жанры  фальклору змешчаны  у дзейнасці гурта.

Напрыканцы неабходна адзначыць, што навуковае даследаванне захавання культурнай спадчыны беларусаў як асновы культурнай разнастайнасці і ўстойлівага развіцця грамадства набывае асабліва важнае значэнне ў перыяд глабалізацыі , калі ствараюцца новыя ўмовы для ўзнаўлення дыялогу паміж супольнасцямі і, у той жа час, узнікае пагроза для захавання традыцыйных духоўных каштоўнасцяў народа.[3,ст.77] Этнапедагагічны падыход  да выхавання падрастаючага пакалення мае вялікае значэнне і арыентаваны на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адраджэнне духоўна-маральных каштоўнасцяў. [ 4,ст.109] Шэраг з'яў культуры мінуўшчыны,негледзячы на іх архаічнасць ,дапамагаюць чалавеку лепш зразумець сваё месца ў сучаснай культуры, сфармуляваць сваё стаўленне да яе. [5,ст. 113] Таму вельмі важна прывіць любоў да фальклорнай спадчыны Беларусі маладое пакаленне.

Дзякуючы дзейнасці кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ студэнты маюць магчымасць не толькі дакрануцца да найбагацейшай спадчыны нашай краіны, але і самі прыняць актыўны ўдзел у сучаснай этнафанічнай культуры. Студэнты удзельнічаюць ў праграмах і праектах па захаванні традыцыйнай культуры Беларусі. Ладзяць фальклорныя экспедыцыі ,камунікацыйную дзейнасць з носьбітамі традыцыі і ўдзельнічаюць ў шматлікіх фальклорных фестывалях. За час навучання студэнты добра знаёмяцца і асэнсоўваюць традыцыі кожнага рэгіёна Беларусі, але ж кожны гурт робіць асаблівы упор на тыя рэгіёны, адкуль родам яго ўдзельнікі. Падчас навучання студэнты самі становяцца генератарамі і транслятарамі этнафанічнай культуры беларусаў. Пасля заканчэння вышэйшай школы яны ствараюць калектывы і прапагандуюць у іх традыцыйны фальклор беларусаў, што вельмі важна для развіцця грамадства . прыкладам таму з'яўляюцца выпускнікі прошлага года , якія скаладалі гурт "Этнасуполка". Такім чынам выхаванне студэнтаў у гуртах кафедры мае найвялікшае значэнне на шляху захавання найбагацейшай культурнай спадчыны беларускага народа. Асэнсаванне беларускага фальклору моладзю сёння мае фундаментальнае значэнне для развіцця беларускай культуры ў будучыні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура:


1. 222 альбомы беларускага року,Мн2006.,артыкул В.Мартыненка;
2. Аўтэнтычны фальклор: праблема вывучання,захавання, пераймання,Мн.2001,артыкул В.Калацэя;

3. Аўтэнтычны фальклор: праблема вывучання,захавання, пераймання,Мн.2001,артыкул В.Шараі;
4. Аўтэнтычны фальклор: праблема вывучання,захавання, пераймання,Мн.2001,артыкул А.Дзедавец
5. Аўтэнтычны фальклор: праблема вывучання, захавання, пераймання,Мн.2001,артыкул Э.Дарашэвіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ